Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 23 Вільня, Нядзеля 20 Ліпня 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:	„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл..	Цана абвестак:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.	ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.	на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр.. на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў адной шпальце

Па выбарах у Сьвянцянскім вокрузе.

Соймавыя выбары ў Сьвянцянскім вокрузе, якія адбыліся 1928 г., дзеля некаторых няправільнасьцяў, былі Найвышэйшым Судом скасаваны. Новыя выбары ў гэтым вокрузе адбыліся 13 ліпня сёл. г.

Вынікі гэтых выбараў наступныя: усіх грамадзян, маючых права галасаваць у Сьвянцянскім вокрузе (паветы: Сьвянцянскі, Браслаўскі, Дзісненскі, Пастаўскі) 249,128 чалавек; галасавала нямнога, бо толькі 67,361 што становіць 27 прац.; галасоў нявяжных, бо адданых на неіснуючыя нумары 13 (камуністы) і 47 („Змагаңцы“) — 8966, № 2 (ППС) атрымаў — 6601 голас — 1 мандат, № 3 (Вызваленьне) — 5440 голасаў — ніводнага мандату, № 10 (Стронніцтво Хлопске)—21,642 галасы — 3 мандаты.

№ 18 (Блёк Нацыянальных Меншасьцяў) 12,385 галасоў) — 1 мандат.

№ 24 (паны і польскае духавенства) — 11,983 галасы — 1 мандат.

Для нас, адзіных, можна сказаць, у сучасным беларускім адраджэньні беларускіх народнікаў, вынікі гэтых выбараў даволі памысныя. Мы атрымалі 12,385 галасоў пры варунках, калі можна было не атрымаць і гэтага.

Прыступалі мы да выбараў толькі дзеля таго, каб даведацца, што народ сам можа зрабіць і сколькі ён мае народнай беларускай сьведамасьці. Дзеля таго праца з нашага боку была самая малая, ня мелі бадай ніводнага платнага агітатара, газэту „Бел.-Крыніцу“ за выбарны час выпусьцілі толькі раз, агулам тлумачачы народу, што верны сын Беларусі павінен галасаваць за № 18.

Далей, добра ацэніваючы выбары, як практычна нічога нявартыя пры сучасных палітычных варунках у Польшчы і сам народ агулам выявіў да выбараў зацікаўленьне невялікае і масова ад іх устрымліваўся.

„Беларускія“ паслы Валынец і Дварчанін, якія апошнім часам ня маюць у сваей працы нічога супольнага з беларускім народным рухам, у гэтых выбарах агітавалі процій нас і заклікалі галасаваць на пустыя нумары: камуністычны № 13 і на 47 „Змаганьне“. А пэўне-ж, людзі нацыянальна нясьведамыя часта іх заклiку слухалі.

Апрача гэтага на наш № 18 сусім не галасавалі і іншыя нацыянальныя меншасьці, як жыды, старавеpы, літоўцы. Словам, 12,385 галасоў, якія далі нам аднаго пасла, а якіх дужа мала не хапала на пасла другога — гэта сапраўды армія верных жаўнераў, якія стойка умеюць пастаяць за народную справу, якіх нямогуць зьбіць з правільнай дарогі ніякія палітычныя падходы нашых ворагаў. Гэткі элемэнт — гэта задатак беларускага нацыянальнага і соцыяльнага вызваленьня.

Усе-ж тыя беларусы, якія слухаючы чужацкіх падшэптаў або марнавалі свае галасы, аддаючы іх на неіснуючыя нумары, або на эндэцкі № 24, або № 10 польскіх асаднікаў на нашых землях, хутка самі пераканаюцца, якое вялікае яны зрабілі зло сабе і ўсяму свайму народу.

З усяго гэтага вывад адзін — шмат дагэтуль зрабілі мы на народнай беларускай ніве, але многа раз больш астаецца нам зрабіць там.

Дык маючы ўсё гэта на воку з абноўленай і ўдвоенай энэргіяй возьмемся за плуг на беларускай ніве!...

Праф. др. Ян Шэдівы ў гасьцях у беларусаў.

У суботу 12 ліпня с. г. праф. др. Ян Шэдівы, славэнец з Югаславіі, прыбыў у Вільню да Беларусаў.

Праф. др. Ян Шэдівы адведаў высока паважанага сярод беларусаў кс. Адама Станкевіча, рэдактара „Хрысьціянскай Думкі“, пазнаёміўся з рэдактарам нашай газэты Я.



Праф. др. Ян Шэдівы.

Пазьняком, рэдактарам „Шляху Моладзі“ М. Пяцюкевічам і ў вышэй успомненым таварыстве правёў некалька гадзін часу. Адведаў так-жа беларускі музэй.

Праф. др. Ян Шэдівы ёсьць вялікім прыяцелем Беларускага народу. Цяпер моцна цікавіцца палажэньнем Беларусаў пад Польшчай.

Праф. др. Ян Шэдівы ёсьць рэдактарам словэнскае часопісі „Словэнец“, органу міністра д-ра Карошэца, якая выходзіць у Югаславіі.

У сьвеце югаслаўскае публіцыстыкі праф. др. Ян Шэдівы займае першараднае месца побач старшых публіцыстаў. Знаючы ўсе славянскія мовы, праф. др. Ян Шэдівы піша часта на славянскія тэмы. Будучы змагаром за ідэю аб'еднаньня ўсяго славянскага сьвету, праф. др. Ян Шэдівы цьвердзіць, што дзеля гэтага аб'яднаньня ёсьць неабходнасьцю **незалежнасьць** Беларусі і Украіны.

Гэтая думка, праўдзіцца так-жа і чэхамі, але чэскі думаючы сьвет у славянскім пытаньні дзеліцца на дзьве часткі. Першая частка, ідэолёгам якой зьяўляецца др. Кароль Крамар, ёсьць ультра-русафільскаю, паводле думкі якой будучыня Славянства можа разьвівацца толькі пад апекай Масквы. Другая частка чэскага думаючага сьвету ў гэтым пытаньні, душой і мазгамі якой зьяўляецца праф. др. Т. Масарык ідзе шляхам брацтва, цьвердзячы, што будучыня Славянства ажыцьцёвіцца толькі на падставе волі кожнага славянскага народу і брацкага паразуменьня ў супольнай творчай працы.

Гэты шлях, які адкідае ўсялякія гвалты і будуецца на волі і роўнасьці кожнага народу, у сяньняшнім славянскім сьвеце, думаючым аб ідэі згоды і лучнасьці славянскай, мае найбольш пасьлядоўнікаў. Праф. др. Ян Шэдівы так-жа належыць да ліку гэтае вялікае арміі, якая ёсьць фундамантам згоды і лучнасьці Славянства.

Мы заўсёды астаёмся вернымі гэтай ідэі, якая будуецца на жыцьці Беларускага народу, а не на Яго сьмерці.

Выяўляючы нашыя пагляды на вялікую ідэю сапраўднае і справядлівае згоды Славянства, **жадаем праф. д-ру Яну Шэдівыму добрых пладоў у ягонай славянскай працы.** П.

Крызысы і сучасны земляробскі крызыс.

Не адзін селянін, перажываючы такі цяжкі час, калі збожа ідзець проста за ніштo ў параўнаньні з даражынёй фабрычных тавараў, задумаецца над тым, дзе гэтаму прычына. Чаму гэта адзін раз цана бывае вялікая, а іншы раз яе зусім няма? Заглянуўшы ў гэтай справе ў розныя газэты можна ўсюды спаткацца са словам: крызыс, земляробскі крызыс, ён таму вінават.

А што-ж такое гэты земляробскі крызыс і крызыс наагул? —

Сучасны гаспадарчы лад так пабудаваны, што няма ніякага агульнага пляну і парадку ў сусьветнай ці то прамысловай ці земляробскай вытворчасьці. Пасьля сусьветнай вайны кожная дзяржава кіруе сваім экономічным жыцьцём так, каб выцягнуць якнайскарэй і найбольш для сябе зыскаў, не азіраючыся на благія гэтага вынікі агулам. Дзяржавы адгараджываюцца ад конкуруючых вырабаў чужых старонак спецыяльнымі законамі і мытнымі межамі, часта здараюцца т. зв. мытныя войны, а і да сапраўднай вайны ня так далёка, бо кожная дзяржава збраіцца сколькі мае сіл. Ваеныя патрэбы глытаюць вялікую частку грамадзкага дабра

Безпляновосьць у экономічным жыцьці даводзіць да таго, што кожная дзяржава стараецца выпрацаваць усяго столькі, сколькі яна ў сілах вырабіць і пасьля нейкага часу якіх-небудзь тавараў аказваецца за шмат. Цана на гэты тавар пачынае моцна падаць. Вялікі лік слабейшых вытварцоў гэтага тавару паносіць аграмадныя страты і банкрутуе; вытворчыя варштаты зачыняюцца, маса рабочых выкідаецца на брук. Астаюцца на сваіх мясцох толькі мацнейшыя капіталісты.

Вось абраз крызысу.

Далей, накопленыя запасы тавараў памаволі зужываюцца, цана на іх падымаецца, астаўшыяся вытварцы бяруць вялікія цэны, бо няма конкурэнцыі. Але людзі, бачучы вялікія карысьці з вытвору гэтага тавару, ізноў больш бяруцца за выраб яго. Згэтуль паўстаець ізноў конкурэнцыя, ізноў перапаўненьне рынкаў і ізноў крызыс.

І так крызысы бываюць стала, праз нейкі працяг часу. Але бываюць крызысы большыя і слабейшыя. Слабейшых мы часам на‘т не заўважаем, бо яны ня так прыкметныя, але затое большыя крызысы, як напрыклад цяперашні земляробскі, даюцца ўсім у знакі.

Церпяць ад гэтых крызысаў, найбольш драбнейшыя прадпрыемцы і работнікія масы. Карыстаюць буйныя капіталісты выкарыстоўваючы спагадны для вытворчасьці пасьлякрызысовы час. У земляробскім ўсе белы крызысу зносіць земляроб, бо ён зьяўляецца адначасна і прадпрыемцам і работнікам.

Прычын, якія зложыліся на сучасны земляробскі крызыс, многа. Перадусім аграмадныя прасторы зямлі ў ваўсіх частках сьвету, занятыя пад збожа, некалькі гадоў

даволі добрых ураджаяў і назьбіраўшыся запас з папярэдніх гадоў, шпаркае разьвіцьцё земляробства ў новых старонках Паўднёвай Амэрыкі (Бразыліі, Аргентыне і інш.) спрычыніліся да таго. што ўсякага збожа на сусьветным рынку аказалася вельмі многа, і цэны страшэнна палі. Цэны-ж на фабрычныя тавары асталіся высокімі.

Яшчэ ні разу ад Вялікай вайны крызыс ня прымаў такіх грозных разьмераў.

Бязумоўна, земляробскі крызыс пацягнець за сабой крызысы і ў іншых галінах гаспадарскага жыцьця, а перадусім у блізкай сабе галіне гадоўлі жывёлы. Бо зразумела, што шмат хто, бачачы такія нізкія цэны збожа, будзе карміць ім жывёлу, каб посьле прадаць яе за дарагую цану (дарагую ў параўнаньні з цаной збожа). Гэта ізноў пацягне няміnуча за сабй паніжэньне цаны на жывёлу. Ужо пара месяцаў таму назад дзяржаўны Інстытут кантролі земляробскіх рынкаў у Нямеччыне перасьцярагаў нямецкіх земляробаў перад вялікай зьніжкай цэнаў на нерагатую жывёлу. Зьніжка гэтая прадбачыцца на вясну 1931 году прыблізна на месяц сакавік. Гэтая перасьцярога ня будзе лішняй і для нашага сялянства, бо крызыс у Нямеччыне бязумоўна будзець мець свой уплыў і ў нас.

Адаб'ецца таксама земляробскі крызыс на гандлі і промысьле. Ужо цяпер можна заўважыць па нашых мястэчках вялікі застой у гандлі. Селянін ня маець за што купляць і абыходзіцца таварамі першай тольк і патрэбы. Жыдкі і іншыя нашыя гандляры жаляцца на брак якога небудзь руху і што ідзець разам, — лаходу.

Ня маючы каму збыць свае тавары пачынаець корчыцца і промысл і хутка трэба спадзявацца моцнай хвалі банкруцтваў, а за імі новыя масы рабочых далучацца да ўжо і так вялікай, рухлівай і неспакойнай арміі безработных.

Ніякага асаблівага спосабу зарадчага гэтаму крызысу няма і ня можа быць. Тут толькі адзін ёсьць лекар — час.

В.

З газэт.

„O nową erę w stosunkach polsko-białoruskich".

Пад гэткім загалоўкам „Кур. Віленскі" (11.VII.1930) зьмясьціў цэлы артыкул, у якім выражае сваю радасьць з прычыны „новай эры" у польска-беларускіх адносінах. Бачыцьжа пісака з „Кур. Віл." гэтую „новую эру" ў тым, што з прычыны прыезду ў Вільню Прэзыдэнта Польшчы „дзялачэ бялорусцы з А. Луцкевічэм на чэле" выдалі нумар „Наперад" (21.VI.1930), у якім свае вернападданства да ўраду выразілі ў стылю Паўлюкевіча—Умястоўскага. Пэўнеж, для Луцкевіча і „кумпаніі" гэтая „новая эра" нішто, але для народу астаецца старая эра, безрабоцьця, галіты агульнай.

З беларускага жыцьця.

Новы доказ „справядлівасьці" арцыб. Ялбжыкоўскага да беларусаў. Ведамы беларускі ксёндз др. Язэп Рэшаць, які нядаўна польскімі ўладамі за беларускую працу сярод моладзі пазбаўлены пасады ў вучыцельскай сэмінарыі ў Беластоку, урэшце назначаны на пробашча ў... Монькі, але за Беласток, у польскую парафію, каб такім чынам пазбавіць яго ўсякай магчымасьці працы для свайго народу. Як даведываемся, кс. Рэшаць ад гэтай „ласкі" адмовіўся. Гэтак выглядае „каталіцкая" справядлівасьць арцыб. Ялбжыкоўскага!...

Назначэньне на ўніяцкага біскупа кс. Бучыса. На ўніяцкага біскупа ў Польшчы Папа Рымскі нядаўна назначыў кс. др. Бучыса. Трэба спадзявацца, што кс. Бучыс, як літовец па народнасьці, спыне полёнізацыйную і русыфікацыйную работу сярод беларусаў, якая пры помачы ўніі штораз вылазьней праводзіцца на нашых землях. Трэба також аднача сна і дзівіцца з гэтага назначэньня — беларусаў намаўляюць да ўніі, але без беларусаў!

З Беларуска-Літоўскага Каталіцкага Камітэту. Беларуская і літоўская каталіцкая праца спатыкае ўсьцяж новыя перашкоды. Як даведываемся, нядаўна выбранаму на Зьездзе Беларуска-Літоўскаму Каталіцкаму Камітэту ўрад ня хоча дазволіць працаваць без адумысловага статуту. З гэтае прычыны Камітэт гэны думае апрацаваць рэгулямін ці мо і статут і залажыць Беларуска-Літоўскае Таварыства.

Беларуская вучыцельская сэмінарыя. Як даведываемся, урад ў Вільні мае залажыць беларускую вучыцельскую сэмінарыю. Сэмінарыя мае быць дзяржаўнай. Дзеля гэтага кіраваць ёй мае сам урад пры помачы беларускіх полёнофілаў: Луцкевіча і Янкі Станкевіча, які, як чуваць, мае быць „выхаваўцам" у сэмінарыі. Прадстаўляем сабе „выхаваньне" нашай моладзі там, дзе „выхаваўцам" будзе „слаўны" Янка! Там-жа ня цырк мае быць, а сэмінарыя! Да мэтаў гэтай сэмінарыі і яе арганізацыі яшчэ вернемся няраз.

Купальле ў Шутавічах. 6 ліпня с. г. Гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры ладзіў Купальле. Парадак сьвяткаваньня быў наступны: у вечары, у весцы, старшыня Інстытуту кс. В. Гадлеўскі прачытаў лекцыю аб пачатках Беларусі, яшчэ пазьней пасьля гэтага, у лесе, на лоне прыроды была адыграна пьеса „На папасе". Пасьля пьесы, пры шыбаючых агнёх, адбыўся пачастунак, на якім прамаўлялі прысутны там кс. А. Станкевіч, кс. В. Гадлеўскі, было так-жа прадаклямавана некулькі вершаў. На жаль больш ня было ані прамоў, ані дэклямацыяў, бо прысутная паліцыя чамусьці забараніла. Забарона гэта на прысутных сьвяткавальнікаў зрабіла дужа цяжкое ўражаньне. Затое стройная песьня беларуская разлягалася голасна аж да познай ночы. Прысутных з розных нават даволі адлеглых вёсак было каля сотні, пераважна моладзі.

Прыкладная праца Гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры ў Будславе Вялейскага павету даў справаздачу Цэнтр. Ураду Інстытуту з сваей дзейнасьці за час ад I.IV да 30 VI с. году г. зн. за тры месяцы, якая выглядае вось так:

1. Паседжаньняў ураду гуртка было — 2; 2. Гурток зладзіў 4 беларускія прадстаўленьні ў в. Алешках, Крупніках па адным прадстаўленьні і два ў м. Будславе; 3. Гурток выпісываў нармальна беларускія газэты і закупіў шмат кніжак для бібліатэкі; 4. Гурток налічывае 16 сяброў, новых сяброў уступіла 3-х (сябры — жанчыны ад аплаты складак звольнены); 5. Стан касы на 30.VI наступны: прыход — 169 зл. 65 гр., расход — 145 зл. 30 гр., астача — 24 зл. 35 гр., 6. Гурток і надалей мае намер весьці такую ж працу.

Дзейнасьць Будслаўскага Гуртка Інстытуту, яго ўмелая арганізованая праца, а з гэтага выплываючая самавыстарчальнасьць, разумная і сьведамая падпарадкаваньне сваім цэнтральным уладам, павінны паслужыць многім гуртком Бел. Інстытуту Гасп. і Культ. прыкладам.

Канфіската Беларускай прэсы. Канфіската „Сялянскае Нівы". Па загаду адміністрацыйных уладаў сканфіскаваны № 6 „Сялянскае Нівы" з дня 7 ліпня с. г. за стацьці: „Беларуская санацыя ўжо бяз маскі", за жарт „Грамата Беларускіх поленафілаў „Пятай Брыгады" і за перадрук з польскай газэты „Роботнік" гутаркі пасла Ф. Ярэміча з супрацоўнікам тае-ж газэты.

Калі-б дабавіць да букету загалоўкаў сканфіскаваных стацей „Беларускае поленофільства", за якую сканфіскаваны № 21 „Бел. Крыніцы" з дня 28 чэрвяня с. г., дык ясным стане, што падрабязна пісаць аб беларускай санацыі, якая групуецца каля газэты „Наперад", ня сусім бясьпечна.

Памятнік Пятру Крэчэўскаму, Старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Памёршаму на эміграцыі ў Чэхаславацыі старшыні Рады Беларускай Народнай Рэспублікі Пятру Крэчэўскаму, беларусы-эмігранты паставілі памятнік. Дня 4 г. м. на Альшанскіх могілках у Празе чэскай адбылося ўрачыстае адкрыцьце памятніка.

Слава памяці Пятра Крэчэўскага, змагара за волю Беларускага народу!

Лік беларускай інтэлігенцыі ўзрастае. У сёлетнім акадэмічным годзе скончылі вышэйшыя навукі: Эдуард Крэчка, Мікалай Шкелёнак — бышы старшыня Б. С. С. з науковымі тытуламі магістраў права і Максім Амяльяновіч з тытулам д-ра мэдыцыны.

Беларускі календар выд. Война па бачыў сьвет. Беларускі адрыўны календар на 1930 г. выданы А. Войцікам, як ведама быў адм. уладамі сканфіскаваны. Суд канфіскату ўжо зьняў і аддаў наклад выдаўцу. Календар ужо прадаецца ўва ўсіх беларускіх кнігарнях па 70 гр. экзэмпляр.

Ніва.

Быццам мора шуміць,
Быццам гай шапаціць
Ніва каласістая;
Быццам срэбра блішчыць,
Быццам шкло зігаціць
Ніва залацістая.

Жаці прыйдзе ўраз час,
Хлябок будзе у нас:
Каласы жыта ўжо наліваюцца.
Сэрца чую я стук...
У небе ўецца жаўрук
І пяе ён сабе, заліваецца..

У жыце шмат васількоў
А над ім мятлікоў
Цэлы рой зігаціць, увіваецца...
Як зірнеш, паглядзіш —
Усюды мілая ціш!...
Бяда-гора ўміг забываецца.

Жаці прыйдзе ўраз час,
Хлябок будзе у нас:
Каласы жыта ўжо наліваюцца.
Сэрца чую я стук...
У небе ўецца жаўрук
І пяе ён сабе, заліваецца.

1927 г. С. Пяюн.

З украінскага жыцьця.

Вялікі судовы працэс. Праз цэлы месяц чэрвень с. г. адбываўся ў Львове суд над 17 украінцамі, якіх абвінавачывалі у прыналежнасьці да нелегальнай Украінскай Вайсковай Арганізацыі (УВО).

У гэтым працэсе пракурор і сьведкі з боку пракуратуры даказвалі, што Украінская Вайсковая Арганізацыя, якая існуе нелегальна, вядзе безкампромісовую барацьбу за незалежнасьць Украіны.

Львоўскі Акружны Суд закончыў разгляд гэтай справы прысудам, якім засудзіў: Рамана Біду на кару сьмерці, а 7 асоб ад 2 да 4 гадоў цяжкой турмы. Рэшту абвінавачаных Суд звольніў ад віны і кары.

Абарона засуджанага Біды падала касацыю. Падала так-жа касацыю і пракуратура.

Сьвята ўкраінскага вучыцельства. Дзень 7 ліпня с. г. сьмела можна назваць днём украінскага вучыцельства. На 25-ыя ўгодкі Т-ва „Взаймной Помочі Украінського Вчительства" зьехалася ў Львоў каля паўтары тысячы вучыцялёў, каб адсьвяткаваць юбілей сваей вучыцельскай арганізацыі.

Сьвяткаваньне юбілею пачалося ўрачыстай акадэміяй і закончылася агульным пачастункам. Зьехаўшыхся на юбілей 25-х угодкаў ВПУВ віталі ўсе украінскія культ.-прасьв. арганізацыі і палітычная арганізацыя УНДО. На агульным пачастунку першым вітаў вучыцялёў старшыня УНДО др. Д. Лявіцкі. Прамаўлялі і многія іншыя прамоўцы. Прамовы перапляталіся стралецкімі песьнямі.

З гордасьцяй маглі паглядаць на сваю працу сівагаловыя ініцыятары арганізацыі, якая сьвяткавала свае 25-ыя ўгодкі пры такім ліку учасьнікаў аб'едналых адною супольную думкай.

На другі дзень г. зн. 8 ліпня адбыўся агульны сход сяброў Т-ва ВПУВ. Прад адкрыцьцем сходу ўсе учасьнікі пайшлі ў царкву сьв. Юра, дзе а. пралат Куніцкі адправіў набажэнства з нагоды 25-лецьця існаваньня Т-ва ВПУВ. Пасьля набажэнства адбыўся звычайны гадавы сход Т-ва.

Калі будуць такія ўрачыстасьці у нас? А да такога стану дайсьці мусім!

З Літоускага жыцьця.

З ЛІТВЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ.

10-лецьце Літоўска-Савецкага мірнага дагавору. 12 ліпня с. г. скончылася 10 гадоў ад дня падпісаньня мірнага дагавору між Літвой і С.С Р.Р. З гэтай прычыны літоўскі міністр загранічных спраў др. Заўнюс падаў у газэты, што хоць літоўскі народ сам сабе здабыў незалежнасьць, аднак прызнаньне Літвы Расеяй і мірны між гэтымі дзяржавамі дагавор, на ўмацаваньне літоўскай незалежнасьці мелі вялікае значэньне. Прыпомніў такжа міністар, што ў рыскім польска-савецкім дагаворы ёсьць пункт, што Саветы між Літвой і Польшчай прызнаюць тую граніцу, якая будзе гэтымі дзяржавамі дабравольна ўстаноўлена.

Пажар зьнішчыў кніжку аб Вільні. Нядаўна ў Коўне ў выдавецтве „Швітурыс" выбух пажар, які між іншымі вялікімі шкодамі, зьнішчыў сьвежа выданую кніжку аб жыцьці літоўцаў пад Польшчай пад назовам „Віленская Гольгота".

З ЛІТВЫ ПАД ПОЛЬШЧАЙ.

Адняцьце праваў Гімназіі. Віленскі Школьны Куратар паведаміў дырэкцыю Віленскай Літоўскай Гімназіі, што Міністэрства Асьветы на школьны 1930-31 год гімназіі гэтай адымае правы. У зьвязку з гэтым паходам польскай улады проціў літоўскай школы, Літоўскі Тымчасовы Камітэт выслаў да Міністэрства дэлегацыю, дзе яна даведалася, што правы адняты за тое, што выхаваньне вучняў вядзецца, „nie w duchu państwowym". Гэта звычайны довад польскага ўраду проціў асьветы нацыянальных меншасьцяў у Польшчы.

З жыцьця „Літоўскага Дабрадзейнага Т-ва". На апошнім сабраньні Літ. Дабрадз. Т-ва адбыліся перавыбары. На старшыню выбраны кс. К. Чыбірас. Таварыства гэта сярод віленскіх літоўцаў вядзе выдатную дабрадзейна-прасьветную працу.

З Польшчы.

Кангрэс апазыцыі ў Кракаве 29 чэрвеня с. г. адбыўся. Трудна было спадзявацца, што так шумна склікаўны гэты кангрэс пройдзе спакойна. Тымчасам кангрэс адбыўся як найспакайней. Санацыя абмяжавалася адозвамі і камунікатамі, у якіх, падложна падпісываючы праваныроў апазыцыі, паведамляла аб адкліканьні кангрэсу, а кангрэс здаволіўся вострымі рэзалюцыямі, якія не пабачылі сьвету, бо ўлады сканфіскавалі іх.

Як вялікі быў гэты кангрэс, яшчэ і дагэтуль дакладна няведама. Апазыцыйныя газэты падаюць, што на кангрэс зьехалася больш 30 тысяч асоб, а санацыйныя газэты цьвердзяць, што ня больш як 5 тысяч. Незацікаўленыя кангрэсам налічываюць учасьнікаў кангрэсу каля 12 тысяч асоб.

На кангрэсе прамоўцы заяўлялі, што мэта кангрэсу — паваліць дыктатуру Пілсудзкага і ўзяць у свае рукі кіраўніцтва дзяржавай. Гэта цяпер адзіны кліч польскай апазыцыі, толькі адна бяда, што санацыя выпускаць улады з сваіх рук ня думае.

Спорыць з цьверджаньнямі, што сяньня ў Польшчы існуе ўкрытая дыктатура — рэч лішняя. Не паверыць гэтаму ўжо нават і сама санацыя, якая хацела-б гэтую дыктатуру ўтрымаць і надалей.

Чаму санацыя ня хоча зрабіць з гэтай укрытай дыктатуры, дыктатуру адкрытую?

А вось чаму. Яўная дыктатура пануе, або гіне. Укрытую дыктатуру можна замяніць дэмократычным урадам. Можна пайсьці на кампраміс з іншымі палітычнымі партыямі і стварыць парлямантарную большасьць. Для яўнай дыктатуры гэткія выхады закрыты.

Для санацыі ясна, што пры цяперашнім гаспадарчым крызісе ў Польшчы, якога ня дасьць рады зьліквідаваць ані якая дыктатура, таксама як і ніякі парлямантарны урад, яўная дыктатура ўтрымацца ня зможа, бо ўсё гэтае няшчасьце гаспадарчага крызысу пайшло-б на рахунак яўнай дыктатуры.

Апазыцыя гэта добра ацэнівае і дзеля гэтага столькі гуку робіць аб кракаўскім кангрэсе.

Кракаўскі кангрэса пазыцыі, бязумоўна, стварыў у Польшчы новую сытуацыю, якая разьвязаць можна двама спосабамі: або санацыя з некаторымі партыямі, прыкл, „Стр. Хлопске" і падобнымі пойдзе на кампраміс і створыць парлямантарную большасьць, або сьпярша новыя выбары, а пасьля кампраміс.

З заграніцы.

Ангельскія парлямэнтарысты аб нацыянальных меншасьцях. 78 ангельскіх паслоў, якія належаць да лібэралаў і партыі працы ўручылі прем'еру англ. ураду пэтыцыю, у якой дамагаюцца ад прем'ера, каб ён паставіў на парадак дня ў Лізе Народаў, якая адбудзецца ў верасьні, справу нац. меншасьцяў. Пэтыцыя зьвяртае ўвагу, што дасюлешняя процэдура Лігі Народаў у справах нац. менш. ня ёсьць выстарчаючай для ахароны нац. меншасьцяў.

Трэба зазначыць, што дасюлешняя ахарона нац. меншасьцяў Лігай Народаў ёсьць звычайнай насьмешкай.

Звальненьне Надрэніі. Пасьля 12-ці гадовай акупацыі. 1 г. м. з Надрэніі акупанты (французы і ангельцы) выехалі і гэтая краіна сталася вольнай пад уладай прыўнага гаспадара яе — Нямеччыны.

Акупацыя Надрэніі — гэта была калодка, прывязаная да ног Нямеччыны, каб яна часамі не паваліла Вэрсальскага плоту, які так нявыгадны для Нямеччыны.

Вось, калі гэтую калодку адвязалі, Нямеччына пачала мацней гаварыць аб перагглядзе Вэрсальскага трактату, пераважна тых пунктаў, якія датычаць польска-нямецкай граніцы.

Фінляндыя выганяе камуністаў. У Фінляндыі камуністычны рух даволі сільны. У сойме было 33 кам. паслоў, якія выступалі проціў Фінл. дзяржавы і падгатаўлялі „злучэньне" з Саветамі.

Цярпеньне у патрыётаў Фінл. урвалася і пачалі яны тварыць проціўкамуністычную арганізацыю. У гэтую арганізацыю паваліў народ тысячамі. У сталіцы Фінляндыі — Гэльсінгфорсе, 7 чэрвеня с. г. 20 тысячная зарганізаваная грамада пачала дэмонстраваць проціў камуністаў. У іншых мясцовасьцях, насельніцтва пачало нападаць на камуністаў і выкідываць іх заграніцу — у Саветы. Дэмонстранты арыштавалі некалькі камуністычных паслоў і аддаўшы ўладам дамагаліся суду над імі. Пад гэткім націскам урад падаўся ў адстаўку. Новы урад утварыўся, які не сымпатызуе з камуністамі.

Савецкія газэты пішуць, што гэта падгатоўка да паходу проціў Саветаў ад Балтыку да Чорнага мора.

У страху заўсёды вочы вялікія.

Амэрыка сканфіскавала расейскае дрэва. Амэрыканская ўлада заквэст'ёновала транспарт 4-х мільёнаў штук расейскага дрэва, матывуючы, што гэтае дрэва вырубалі вязьні, якіх бальшавікі ўжываюць да вырубкі лесу на мурманскай тэрыторыі.

Аб гэтым мы ў свой час пісалі, што камуністы дзеля таго толькі і арыштоўвалі цэлыя тысячы карэльцаў, каб саслаць у ссылку і гэтакім спосабам прымусіць безплатна рубаць лес.

Да нас пішуць.

НЯГОДНЫ СПОСАБ.

Журыхі, Вялейскага пав. Некаторым азьвярэлым нацыяналістам польскім, беларуская ўрадавая школа ў нашай вёсцы была проста сольлю ў воку і вось гэты дзікі нацыяналізм папхнуў іх у атаку на нашую школу. Ура - патрыёты Польшчы пусьціліся ў атаку на нашую беларускую школу у „свойскі" для іх нягодны спосаб.

Было гэта вось так:

На другой нядзелі пасьля Вялікадня адбываўся ў нашай вёсцы спэктакль. Ставілі тады „Суд" і нейкую польскую п'есу. У гэты-ж дзень прыехалі ў нашую вёску „госьці": камандант з паліцэйскімі і войт. Хадзілі яны па панадворках і сьпісывалі на гаспадароў пратаколы за нячыстату і нешта іншае. Сяляне папалохаліся і чакалі ўжо штрафаў. Аж тут раптам і „амнэстыя" на месцы. Падыходзіць войт і кажа: „будзьце сьмелыя сяляне і ня бойцеся, а паслухайце лепш, што я вам скажу". Пры гэтым вымае паперы (дэкляраціі на польскую школу) і дае сялянам падпісаць. „Падпішыце", кажа, усё будзе добра". Некаторыя сяляне зусім не разумелі, што гэта за паперы, але як-жа не паслухаць пана войта, а іншыя думалі, што ня трэба будзе плаціць штрафу — ўзялі і падпісалі.

Тых, што падпісывацца не хацелі, дык страшылі, што беларуская школа нічога нявартa і што ім у пяць разоў абойдзецца даражэй.

З Журыхаў гэтыя „госьці" паехалі ў вёску Астравы, але іх там не прынялі. З Астравоў паехалі ў вёску Н. Зімодры і там сказалі, што прыдзецца плаціць штраф за тое, што дзеці не акуратна хадзілі ў школу. Пасьля давалі падпісываць дэкляраціі, паказаўшы подпісы Журыскіх сялян, цьвердзілі, што сяляне в. Астравы такжа падпісалі і адна вёска Н. Зімодры нічога нязначa, як капля ў моры—вяскоўцы паслухалі і падпісалі.

Гэтак сабралі подпісы і паехалі сьмяючыся.

Дык чакаем на другі год ужо польскае школы.

Дзеці-вучні плачуць па сваей роднай беларускай школе, бо яны ў ей вучыліся і моцна палюбілі яе. Бацькі іхныя, гледзячы на плач і адчуваючы боль душы сваіх дзетак, скрабучы пяцярнёй патыліцы, охкаючы паўтараюць „ды што-ж мы зрабілі"?. А ура — патрыёты Польшчы сьмяюцца над охканьнем сялян і плачам дзяцей, выкарыстаўшы нясьведамасьць іх бацькоў і ўважаючы сваю нягодную работу за вялікую прыслужнасьць для Польшчы.

Дзіўнае паняцьце патрыятызму і даволі сьмешнае разуменьне патрэб дзяржавы.

Не плачце дзеці! Бог дасьць падрасьцеце і памылкі сваіх бацькоў папpавіце!

Стары Гаспадар.

ДЗІЎНЫ СПОСАБ ПРАВОДЖАНЬНЯ ВЫБАРАЎ.

Юраціская гміна, Валожынскага пав. Кепскі той гаспадар, які псуе лад у гаспадарцы, благі той чыноўнік, які не пільнуецца закону і дрэнна жывецца ў той дзяржаве, у якой чыноўнікі кожны па свойму і як яму выгадней тлумачаць агульныя законы, якімі кіруецца грамадзкае жыцьцё ў краю.

Законы, як ведама, выдаюць людзі. У дэмократычных дзяржавах выдае законы сам народ праз выбраных прадстаўнікоў, а ў недэмократычных — дыктатары, манархі або захапіўшая ўладу дыктатарская партыя, прыкладам цяпер у Расеі партыя камуністычная.

Такіх формаў кіраваньня грамадзкім жыцьцём народу, дзе чыноўнікі што хочуць тое й робяць, на сьвеце пакульшто няма і гэтакая форма называецца анархіяй.

Дык вось пасудзіце людзі, да якой формы трэба залічыць нашае жыцьцё ў Юраціскай гміне.

У палавіне чэрвеня с. г. адбываліся ў нас выбары ў гмінны самаўрад. У Макуцкім абводзе былі назначаны выбары на 15 чэрвеня і на такую пару дня, калі сяляне аніяк ня могуць адлучыцца ад сваей штодзеннай працы. А закон аб выбарах у гмінныя самаўрады, выразна кажа, што выбары гмінныя праводзяцца паводле мясцовага звычаю, г. зн. у тую пару дня і такім спосабам, як людзям найвыгадней. Тымчасам нашыя гмінныя чыноўнікі назначылі выбары, як ім выгадней — на 8 гадзіну раніцы, калі сяляне мусілі даглядаць скаціны. Чыноўнікі „правялі выбары" бяз учасьця большага ліку выбаршчыкаў сялян, пры прысутнасьці некалькіх „безработных" панкоў, за якіх робяць іхнюю работу другія. Рэч зразумелая, што пры такім ліку і такіх выбаршчыках, гмінныя чыноўнікі „выбралі" каго хацелі.

Дык ці гэта парадак і да якой формы трэба залічыць такія парадкі?

Аб гэтым, што праўда, падавалі нашыя людцы скаргу ў староства ў Валожыне, але што з таго!

Дык вось, людцы, пасудзіце самі, у якіх формах грамадзкага ладу знаходзіцца сяньня наш селянін беларус!

БЕЛАРУСКІ СПЭКТАЛЬ.

в. Крупнікі, Вялейскага пав. Гурток Б. І. Г. і К. у Будславе, зладзіў 29-VI-30 г. у нашай вёсцы вечарыну-спэктакль. Пастаўлена было: „Міхалка" і „Гурток" — Башкіра. Спэктакль і вечарына прайшлі ўдала, але на жаль, належыць падкрэсьліць нясьведамасьць тутэйшае моладзі, якая ледзь не сарвала спэктаклю неразумным дамаганьнем зьніжкі цэн білетаў, каторыя без гэтага былі дужа танныя (50 і 30 гр.) Дзеля гэтага-ж Гурток Б. І. Г. і К. пацярпеў невялікі дэфіцыт, а артысты-аматары зьнеахвоціліся да далейшага адведваньня негасьцінных нашых Крупнікаў.

Сорам нашай Крупніцкай моладзі.

Гледач.

„СТРАЛЬЦЫ" НА ЗАКАЗ.

Будслаў, Вялейскага пав. Войт Русецкі напярэдадні прыезду Прэзыдэнта ў Вялейку зрабіў на заказ „стральцоў". Трэба-ж было апраўдаць давер начальства. А тут як на злосьць, няма чым пахваліцца. Не пашле-ж ён на спатканьне Прэзыдэнта Будслаўскі Гурток Б. І. Г. і К.! Дык вось і зрабілі на скорую руку „Стральцоў", якія зьезьдзіўшы ў вайсковых вопратках у Вялейку, зноў разыйшліся па хатах. „Стральца" ў Будславе як ня было так і няма, а п. войт думае атрымаць другі мэдаль за сваю „хітрую выдумку".

Будслаўскі.

КРЫХУ АБ НАШЫМ ЖЫЦЬЦІ.

Дзятлаўская гм., Навагрудзкага пав. Добрага каля нас нічога, а благога на кожным кроку. Найбольш даецца пазнаць сябе, дык гэта паліцыя. Што праўда, то мяняецца яна часта. Нядаўна гэтая найбольш густа разселенае начальства у нас зьмянілася. Каб-жа на лепшае, але то анічуць. Новае начальства і новае знакомства. Сабака не навязаны — пратакол, сьвіньня на вуліцы вырыла яму, ясна — пратакол, падворка дзяўчынка не падмяла — пратакол, каня забыўся выяжджаючы ў лес закелзаць, так-жа пратакол і пашла гісторыя нашага вяскоўца ў староства. Там прачытаўшы, пішуць штраф. Селянін скрабе патыліцу і думае, скуль узяць грошы і як начальству дагадзіць. Акрамя гэтага яшчэ падаткі і свая ўласная бяда проста бяруць за горла і цісьнуць у зямлю.

Можа дзе і лепш жывецца селяніну, але ў нас, дык вось так.

Сьлёзнавокі.

ЗА ЯГАДЫ Б'ЮЦЬ ПАЛКАЙ.

Астрына, Шчучынскага пав. Некалі бывала, дык і яблыкаў ніхто не бараніў падбіраць на зямлі пад яблыняй, а цяпер няможна ў лесе і ягадкі сабраць. Аднойчы лясьнічы, злавіўшы жанчын у лесе, зьбіраючых ягады, адной прабіў палкай руку. Кажуць, што пакрыўджаная падала лясьнічага ў суд. Розум мела-б, каб гэта зрабіла.

Дык вось, якія часы насталі: і за ягады ў лесе плаціць трэба, бо калі не заплаціш, дык лясьнічы руку праб'е.

М. Шчырык.

ЗА РАСТРАТУ СОЛТЫСА АДКАЗЫВАЮЦЬ ТЫЯ, ШТО ВЫБІРАЛІ ЯГО.

в. Гірычы, Навагрудзкага пав. Нашы сяляне, як прыдуць якія небудзь выбары, дык кажуць заўсёды „няхай сабе". Гэтак „няхай сабе" выбралі і солтыса. Гэты солтыс не казаў „няхай", а рабіў па свойму, як ведаў. Сьпярша і сківуць яго трудна было, але пасьля і сам зваліўся. Захварэў на „дэфраўдацыю". Цяпер апісалі ў яго ўсю гаспадарку, а сяляне мусяць плаціць другі раз падаткі, бо солтысава дэфраўдацыя падаткі зьела.

Дык няхай гэта будзе навукай нашым сялянам, што кожныя выбары трэба разглядаць паважна.

С.

ТРЭБА СВАЕЙ БЕЛАРУСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ.

Мураваная Ашмянка, Ашмянскага павету. У нас ужо дзякаваць Богу беларуская нацыянальная сьведамасьць па крысе пашыраецца. Ёсьць ужо адзінкі і моцна сьвядомыя беларусы. Адна бяда, што да гэтай пары няма ў нас ніякай беларускай арганізацыі. А арганізацыя ў нас ўжо ёсьць рэчай неабходнай. Гэная патрэбнасьць свае роднай беларускай арганізацыі выяўляецца і тымі фактамі, што наша беларуская моладзь улезшы неаглядна ў польскую арганізацыю „Стральца" і пачуўшы там дух чужой для беларуса арганізацыі, адтуль уцякае. Гэтакая спроба адбылася ў „Стральцы" праз грамадзяніна Карасевіча, які ўлезшы ў арганізацыю „стралецкую" ўбачыў, што там для беларуса мейсца няма, уцёк адтуль не азіраючыся. Незважаючы на тое, што ў нас арганізацыя „Стральца" складаецца толькі з пяці асоб аднак і гэтыя пяць чалавек мусіць вельмі цэнныя для „polskiej sprawy na Kresach", бо і для пяці „стральцоў" прыстаўлены камандант—сержант.

Пэўне-ж, што ў такой „вялікай" арганізацыі, дзе ёсьць толькі пяць асоб, каманданту-сяржанту работы ня шмат, а без работы чалавек заўсёды нудзіцца. Пакуль пан сержант-камандант польскага „стральца" меў пры сабе сваю жонку, дык было яшчэ сяктак, але як жонка захварэла і выехала кудысьці лячыцца, пану сержанту сусім стала нудна. Каб разьвясяліцца, пан сержант аднойчы запрасіў музыканта, склікаў усіх сваіх „стральцоў", а дзеля таго, што гэтых стральцоў" толькі пяць, аб'явіў „na zabawę mogą przychodzić kto tylko chce". Моладзь, ведама, патанцаваць заўсяды ахвотная, дык пачуўшы музыку, на „забаву" папёрла. Аднак ня доўга забаўлялася, бо пан сержант загадаў прысутным складку грашовую. З грашмі ж, як ведама на вёсцы цяпер вельмі трудна. Паўстала суматоха, у якой дайшло да таго, што іныцыятар „забавы" ўзяў за грудзі, а пасьля і за горла зьненавіджанага ім грам. Карасевіча.

Дык вось да чаго даходзіць на панскіх „забавах".

Дарагая моладзь! Кідай хадзіць на панскія „забавы" дзе цябе зьневажаюць. Арганізуйся ў сваю родную беларускую арганізацыю—залажы ў Мураванай-Ашмянцы гурток Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У сваю арганізацыю выпішы беларускія газэты: „Б.-Крыніцу, „Шлях Моладзі," „Chryścijanskuju Dumku", адчыні сваю біблятэку-чытальню, ладзь спэктаклі, пасьля якіх і патанцаваць можна. У гэтакі спосаб будзеш працаваць над сабой разьвіваючыся умыслова і разьвесялішься. Тады ніхто ня будзе зьневажаць цябе і ты нікога, бо зьневажаць другіх ёсьць няпрыстойна і брыдка.

Пастыр.

Аб гаспадарцы.

Гаспадарскія дробязі.

Упорыстая засуха дрэнна варожа сёлетнім ураджаям наагул, а ураджаям пашы асабліва. Ёсьць ужо догады, што прадбачаная нястача пашы ў хуткім часе кіне на мясны рынак за бязцэн мноства хатняй жывёлы, перад усім сьвіней, якія да нядаўна йшчэ трымаліся ў цане даволі добра. Калі гэта спраўдзіцца, дык нашаму сялянству пагражае новая сапраўдная катастрофа, бо ўсьлед за гэтым прыйдзе ўпадак і на рэшту хатняй жывёлы.

Ясна згэтуль, што трэба старацца ўсякімі магчымымі спосабамі павялічыць запас пашы. Як? Зближаецца жніво. У сьлед за сярпом мусіць прыйсьці плуг. Трэба засеіць мяшанкі расьцінаў матыльковых і па магчымасьці прывалкаваць іх цяжкім гладкім валкам (гэта апошняе толькі тады, калі ня будзе ўсьцяж дажджу і зямля будзе сухая). На лёгкіх грунтох прад заворываньнем па аржышчы добра бывае паразсеіваць на 1 га мяшкі з чатыры каініту, які апрача чыннасьці гнойнай вельмі чынна ўспамагае дзейнасьць жыцьцядайных бактэрый у глебе.

Жніво ўжо вось-вось. Нельга аднак жаць жыта датуль, пакуль „малако" зярняці не заменіцца ў мучную белаватую массу, і пакуль самое зерне ня дасца пераламаць праз пазногаць. Пры зьбіраньні з поля трэба глядзець, каб высахла дакладна салома. Таму чым зелянейшым жнецца жыта і чым больш у ім ёсьць травы, тым меншыя і слабей вязаныя быць мусяць снапкі.

З працаў інж. **А. Клімовіча.**

Наша пошта.

В. Рымдзёнку. Газэту пасылаем.

А. Янчэўсnаму. Просьбу Вашу спаўняем.

Прыхажаніну. Ваша карэспандэнцыя толька выкарыстана, бо цалком яе зьмясьціць не маглі, дзеля таго што ня нашая справа ўмешывацца да духавенства. Калі дадзены сьвяшчэньнік блага паступае, то падавайце скаргу да вышэйшых дух. уладаў, або да суду.

Г. Яновічанцы. Адрэс зьмяняем.

В. Бураку. Друкі Б. Х. Д. пасылаем Вам праз пошту.

М. Паляку. Просьбу спаўняем, на паданыя адрасы газэту пасылаем.

Арс. Сьвяртону. Газэту пасылаем, прысылайце падпісную плату.

Аўгену Сьцепулёнку. Твор Ваш разгледзім, калі падойдзе, то выдрукуем у сваім часе.

Сьлёзнавокаму. З прысланнага карыстаем, пішыце больш.

Будслаўскаму. Дзякуем, карыстаем.

Тумашу. Газэту пасылаем, за прысланае дзякуем.

Дубовіку і Ходзьку. Атрымалі, але не карыстаем, бо ўжо не актуальныя — выбары адбыліся.

А. Хадзінскаму. Атрымалі, дзякуем, карыстаем. Пашырайце сьведамасьць сярод сялян, каб такіх глупстваў не рабілі.

Фр. Макарэвічу. Атрымалі, скарыстаем. Каб Вы залажылі гурток Бел. Інст. Гасп. і Культуры, тады хтось з Вільні пад'ехаўбы і прачытаўбы у Вас лекцыю. Пастарайцеся і залажыце.

Фр. Янкоўскаму. Грошы атрымалі, дзякуем.

WYJŠAU Z DRUKU

„URZĘDOWY PORADNIK LUDOWY"

ŭ sprawach: 1) Sudowych, cywilnych, karnych i wekslowych, 2) Padatkowych i apł. štemplowych, 3) Wajskowych, 4) Administracyjnych i 5) Rožnych z bolš jak 50 uzorami na padańni, adwałańni i skarhi. Kožny hramadžianin budzie mahčy pa nabyćci hetaha parodnika sam sabie ŭ waŭsim radzić u waŭsich štodziennych sprawach u rožnych Uradach, zaaščadžajučy hrošy, trudy i čas.

Cana paradnika razam z pierasyłkaj 1 zł. 75 hr.

Kuplać možna u Biełaruskaj Kniharni Bieł. Wyd. T-wa u Wilni Wostrabramskaja wul. Nr. 1, abo biezpasredna ad aŭtara, pierasyłajučy 1 zł. 75 hr. na konto P. K. O. Nr 81.439.

Nadzwyčajnaja akazija.

Abminajcie pasrednikaŭ i pierakupščykaŭ, nabywajcie tawary prosta z pieršaj krynicy, — na paławinu taniej, čym u wašych miascowaściach. Zaaščadžajcie ciažka zapracawanyja hrošy, wydawanyja ŭ wašych wakolicach, dyk atrymajecie ŭ nas padwojnuju kolkaść tawaru. Cеły kamplekt tolki za 41 zł, jaki nadajecca dla kožnaha domu, a imienna: 3 mtr. waŭnianaha bastonu padw. šyryn. na elehanckaje mužskoje ŭbrańnie, abo palto damskaje (koler wodle žadańnia) 3 mtr. markizy — tawar pušny i miakki na pieknuju i ciopłuju sukniu damsk. (jakija chočučy kolery), 1 daskanalnaja trykotawaja, zimowaja kašula mužskaja. abo žanockaja, 2 mtr. barchanu na ciopły kaptan mužski, abo žanocki. 1 para ciopłych pančoch žan., 1 chustka tureckaja na haławu z pieknymi kraskami, 1 ručnik waflowy. 3 nasowyja chustački (nasatki i adzin duža pryhožy, šaŭkowy halštuk (krawat) światočny. 1 para ciopłych škarpetak mužskich.

Usio heta razam wysyłajem tolki za 41 zł. za zaličkaj paštowaj, pa atrymańni listowaha zawiedamleńnia. Płacicca pry atrymańni z pošty pierasyłki.

Kuplajučy ničoha nie ryzykuje dziela taho, što kali tawar nie padabajecca, prymajem jaho iznoŭ, a hrošy adsyłajem. Tyja, katoryja adrazu prysyłajuć 3 zł. nia płaciać koštaŭ apakunkowych i apłaty paštowaj.

Zakazy prosimo adresawać:
„Polska Wytwórnia"
Łódź, Nowomiejska 17.

Cennik na ŭsialakija tawary wysyłajem biazpłatna.
UWAHA: Taniej ŭžo być nia moža.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч